# Хроніка

## МОВА І СОЦЫУМ

4–5 снежня 1998 г. на філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта адбылася III Міжнародная навуковая канферэнцыя "Мова і соцыум", арганізаваная кафедрай прыкладной лінгвістыкі і Беларускай асацыяцыяй камунікатыўнай лінгвістыкі (БАКЛ). Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі падалі больш за 180 навукоўцаў з Беларусі, блізкага замежжа (Расіі, Украіны, Татарстана, Прыбалтыкі) і замежжа (Аўстрыі, Польшчы, Югаславіі, Кітая, В'етнама, Венгрыі, Ізраіля).

У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў канферэнцыі аказалася мова як сацыялізаваная прастора. Асноўныя праблемы, якія абмяркоўваліся навукоўцамі, вызначылі назвы адпаведных секцый: 1. Сацыялінгвістычная сітуацыя ў краінах Усходняй Еўропы і іншых рэгіёнах; 2. Сацыякультурныя аспекты стуктуры мовы; 3. Палітычны дыскурс у СМІ; 4. Мова СМІ; 5. Мова і нацыянальная культура; 6. Сацыяльнае і нацыянальнае ў аспекце мастацкага ўспрыняцця; 7. Беларуская мова сёння: стан і перспектывы развіцця. Моўныя кантакты; 8. Сацыякультурны аспект у навучанні мовам; 9. Моўная асоба на мяжы стагоддзяў; 10. Сацыялінгвістыка ва ўзаемадзеянні з іншымі лінгвістычнымі дысцыплінамі.

Пленарныя даклады асвятлялі агульныя праблемы лінгвістыкі: Б.Тошавіч (Аўстрыя) "Функцыі мовы", Н.Б.Мячкоўская (Мінск) "Азбучныя войны" і "арфаграфічныя раздоры" з пункту гледжання лінгвістыкі і сацыяльнай псіхалогіі", Л.М.Чумак (Мінск) "Супастаўляльна-культуралагічны сінтаксіс як новая галіна кантрастыўнай граматыкі", У.А.Салееў (Мінск) "Мова і сімбіёз ментальнасцей у шматмоўным грамадстве"; пытанні сучаснай моўнай сітуацыі і моўнай палітыкі ў постсавецкіх рэспубліках: М.І.Канюшкевіч (Гродна) "Праблемы соцыума, які размаўляе на беларуска-рускай мове", Г.Бідэр (Аўстрыя) "Моўная сітуацыя на Заходнім Палессі", Л.Бурэніна (Вільнюс) "Суіснаванне моў у Літве", Л.К.Байрамава (Казань) "Дзяржаўныя мовы Татарстана: моўная мадэль"; лінгва-кагнітыўныя праблемы мовы СМІ: І.Кажэнеўска-Берчынска (Польшча) "Аб кагнітыўных патэнцыях "новамоўных" двукоссяў у сучасным публіцыстычным тэксце", С.М.Прохарава (Мінск) "Адлюстраванне рэчаіснасці на газетнай паласе: фрэймы, падзеі, канцэпты", П.П.Шуба (Мінск) "Дзеепрыметнікі ў мове СМІ".

Характарыстыка сучаснай сацыялінгвістычнай сітуацыі ў краінах свету ў дакладах на першай секцыі грунтавалася на рэтраспектыўным аналізе (Д.Г.Багушэвіч, Л.Р.Машчэнская), на супастаўленні моўнай палітыкі ў славянскіх краінах (Е.В.Коршук, Д.Танась), на выяўленні аспектаў моўных арыентацый білінгваў (А.А.Лукашанец, Т.А.Трахангкіна).

Сацыякультурныя аспекты сістэмы мовы ўсіх узроўняў знайшлі адлюстраванне ў дакладах С.Г.Барбук, Г.А.Гваздовіч, А.Кенька, А.Г.Лукашанец, Г.І.Мядзведева, А.Н.Навумовіч, М.Д.Путравай, Н.Г.Слыхалавай, Т.Г.Трафімовіч (секцыя 2).

Бурныя дыскусіі на пасяджэнні трэцяй секцыі выклікалі даклады В.П.Рагойшы "Лінгвапалітэлогія: сутнасць, функцыі, перспектывы" і С.І.Болдыравай "Сацыяпрагматычныя аспекты даследавання палітычна карэктнай мовы".

Актуальныя пытанні мовы СМІ (секцыя 4) атрымалі адлюстраванне ў шырокім славянскім кантэксце (Т.М.Валынец, К.І.Іваноў), закрануты праблемы нарматыўнасці СМІ (Г.І.Малько, Т.М.Смольская), адзначаны лексіка-семантычныя, фразеалагічныя і сінтаксічныя навацыі ў мове сучаснага друку (В.Н.Радыёнаў, Г.В.Варычэнка, Н.С.Шатраўка, Т.В.Мальцэвіч), разгледжаны прэцэдэнтныя онімы як сродак пазнання і ацэнкі (І.Э.Ратнікава).

Найбольшую цікавасць даследчыкаў выклікаюць праблемы ўзаемадзеяння моў і нацыянальных культур. У дакладах на пятай секцыі прагучала 13 дакладаў, у якіх разглядаліся асаблівасці моўных карцін свету (І.І.Мячыкава, А.І.Яновіч) і маўленчых паводзін славян і неславян (О.В.Даніч, І.І.Токарава), фарміраванне тэорыі культуры маўлення (І.В.Галенка, Л.М.Гамеза), канцэптуалізацыі і метафарызацыі (І.М.Сафронава, І.І.Шкута, Л.А.Ліпіліна, С.В.Вятчаніна, Н.Ф.Венжыновіч), эпанімічных тэрмінаў (А.А.Шарапа, Н.Н.Людчык), узаемадзеянне этнакультур (М.У.Салеева).

Прадметам абмеркавання на шостай секцыі былі праблемы адлюстравання сацыяльнага і нацыянальнага ў мастацкім творы (Г.Ю.Воранава, А.І.Галаўня, Т.Р.Міхальчук, С.М.Пераваладчынская, Т.Ф.Пляханава, Л.Д.Сінькова, Л.В.Алейнік).

На сёмай секцыі сучасны стан беларускай літаратурнай мовы быў разгледжаны ў дакладах В.М.Ляшук і Л.І.Толчыкавай, праблемы моўных кантактаў і супастаўленню – у дакладах І.С.Роўды, Е.В.Лексінай, А.А.Свірыдэнка, праблемы беларусазнаўства – у дакладзе У.А.Навумовіча.

З пазіцый сучаснай метадычнай навукі асвятляліся пытанні сацыякультурнага аспекта ў навучанні мовам (секцыя 8), якія дыферэнцыраваліся па наступных напрамках: 1) замежныя мовы: Л.У.Хвядчэня, Г.П.Саўчанка, Э.Г.Пянькова, Л.А.Васенка; 2) руская мова як замежная: Е.В.Бандарэц, І.А.Агурэева, Л.М.Чумак, В.П.Крыштановіч, Г.Б.Кажушкова, А.І.Глухотка, Н.Н.Гасіева, Н.У.Малочка, А.У.Саннікава, Г.М.Аксёнава, Н.А.Кузняцова; 3) родная мова ў школах і ВНУ: А.Я.Долбік, Л.А.Месяняшына.

Моўная асоба на рубяжы вякоў была прадметам разгляду на дзевятай секцыі. З дакладамі выступілі С.Б.Кураш, А.І.Рэвуцкі і А.Р.Тарасевіч.

Даклады ўдзельнікаў дзесятай секцыі вызначаліся разнастайнасцю тэматыкі. М.А.Аўдоніна, Т.В.Алёхна, М.А.Балоціна, С.У.Вараб'ёва, А.П.Власюк, Л.С.Дзімскіс, І.К.Фамянок, І.В.Нікалаенка, А.А.Папейка, С.С.Сарвіліна, М.В.Свірыдовіч, Д.Т.Мінкевіч, А.Смірнова разглядалі пытанні сувязі сацыялінгвістыкі з іншымі лінгвістычнымі дысцыплінамі.

Наступную IV Міжнародную канферэнцыю плануецца правесці ў снежні 2000 г.

Л.М.Чумак